*Ірына Дунаева*

# РАЗВІЦЦЁ МУЗЫЧНЫХ ЗДОЛЬНАСЦЕЙ І НАВЫКАЎ ШМАТГАЛОСНЫХ СПЕВАЎ ДЗЯЦЕЙ СРОДКАМІ ФАЛЬКЛОРУ

У працэсе вучэбна-выхаваўчай дзейнасці ў фальклорным гурце этнапедагогам неадначасова прыходзіцца сутыкацца з праблемай развучвання новых песенных тэкстаў, фарміравання ў навучэнцаў новых навыкаў выканаўчага майстэрства, іх прафесійнага выкарыстання; і заўсёды паўстае пытанне: «Як найпрасцейшым шляхам дасягнуць жадаемага выніку?»

Большая частка дзіцячага фальклору прасякнута элементамі гетэрафоніі (вар'іравання мелодыі). Варыяцыйны метад засваення дзецьмі песеннага фальклору ў яго найпростым гетэрафонным выкладанні павінен стаць першай ступенню па авалоданню шматгалосымі спевамі. Перш за ўсё, з улікам узроставых асаблівасцей удзельнікаў калектыву (гурта), складаецца вучэбная праграма, дзе падрабязна прапісваецца план работы (мэты, задачы, метады) і падбіраецца рэпертуар, які ў працэсе перспектыўнай вучэбнай дзейнасці якасна і колькасна ўдасканальваецца.

Каб паспяхова развіваць музычныя здольнасці дзяцей і моладзі на аснове беларускіх народных песенных твораў і перайсці да шматгалосых спеваў неабходна прайсці падрыхтоўчы этап – этап папярэдняга азнаямлення дзяцей з шырокім колам народных песень. Пасля таго, як спевакі добра пазнаёміліся з песнямі манадыйнага стылю, калі твор гучыць роўна і ўпэўнена ў аднагалосым выкананні, толькі пасля гэтага варта ўключаць ў вучэбную і выканальніцкую практыку песні шматгалосыя, пачынаючы з засваення гетэрафоніі і дасягаючы вярыянтаў падгалосачна-паліфанічнага стылю (палескіх «спеваў з падводка. Пры гэтым трэба стварыць неабходныя творчыя ўмовы каб абудзіць зацікаўленасць навучэнцаў да народнай песні, ад гэтага таксама залежыць якасць харавога распеву. У працэсе навучання не раз прыдзецца вяртацца да выканання песень ва ўнісон, гэта спрыяе «выраўніванню» галасоў, дасягненню чысціні інтанацыі, адчування ансамбля, уплывае на поспех работы над шматгалоссем [2, 95].

Для таго каб авалодаць навыкамі імправізіцыйнага выканальніцтва, свабоды распеву на галасы і падгалоскі, трэба прайсці пэўную музычную падрыхтоўку з удзельнікамі калектыву, дабіцца іх выдатнай «спетасці», і каб яны навучыліся творчаму падыходу да засваення этнафоніі [1, 156]. У час распявання трэба развіваць у маладых спевакоў здольнасці да самастойнага вар'іравання, задаваць ім спецыяльныя заданні на праяўленне творчай ініцыятывы. Імправізацыя як спосаб засваення шматгалосых спеваў высвятляе вялікія магчымасці для раскрыцця творчага мыслення дзяцей.

Напрыклад, запісы з экспедыцый выкладчыкаў кафедры этналогіі і фальклору БДУ культуры і мастатцваў В. Калацэя і Т. Пладуновай у вёсках Полацкага раёна (абрады «Купалле» і «Жаніцьба Цярэшкі») і Веткаўскага раёна (абрад «Ваджэнне і пахаванне стралы») дапамаглі ім увасобіць у гуртах «Верас», «Ветах» і «Талака» этнафонію гэтых рэгіёнаў. Вельмі важна, што яна прадстаўлена не толькі ў канцэртнай форме, але і ў мастацкай рэканструкцыі ўсяго абрадавага свята. Так, ужо трэцюю зіму гурты гулялі «Цярэшку» у «карчме XXI стагодзя» – мінскім дыска-клубе «Стэп» – а з 2001 года рэгулярна ладзяць свята Купалле ў розных мясцінах пад Мінскам (вёскі Вязынка, Строчыцы, мястэчка Ракаў). Веды пра спосабы голасавядзення, тыпы інтанавання і характар распеву на галасы, атрыманыя педагогамі пры ўключаным назіранні з'яўляюцца для іх саміх адкрыццем і непасрэдным фактам, таму і навучанне гэтым спевам гуртоўцаў абапіраецца на прынцыпы дакладнага пераймання этнафанічных асаблівасцей аўтэнтычных песенных узораў.

Рэпертуар гэтых калектываў уключае шмат абрадавых твораў, развучаных з аўтэнтычных запісаў шасці рэгіёнаў Беларусі, а таксама з фальклорных песенных зборнікаў айчынных фалькларыстаў. Асновай творчай дзейнасці гуртоў з'яўляецца адпраўленне ў натуральных умовах бытавання каляндарна-абрадавых свят Беларусі. Так на пачатку дзейнасці гуртоў «Ветах», «Верас» і «Горнка» аддзела фальклору Нацыянальнага цэнтра мастацкай творчасці дзяцей і моладзі, педагогі вызначылі перспектыўную праграму дзейнасці на аснове каляндарнай абраднасці беларусаў як традыцыйнай сістэмы выхавання дзяцей і моладзі, якая праходзіць па этапах, адпаведных сезоннай прымеркаванасці свят у сістэме т. зв. «Сонечнага крыжа». Два яго стрыжні – летні і зімовы сонцавароты і веснавое і восеньскае раўнадзенствы – акумулююць псіха-фізічныя і інтэлектуальныя намаганні і здольнасці гурткоўцаў, сістэматызуюць набытыя імі веды аб традыцыйнай беларускай культуры [4]. Па меркаванню педагогаў, цыклічнасць гадавога кругавароту «Вясна-Лета-Восень-Зіма» стварае найлепшыя ўмовы для паступеннага і стабільнага вучэбнага працэсу ў калектыве, напаўнення яго колькасна і якасна разнастайным зместам. Паводле перакананасці кіраўніка гурта «Верас» Т.А. Пладуновай, падчас заняткаў у спеўнай суполцы дзіця паступова, дыдактычна выверана уваходзіць у свет культуры беларусаў не толькі светасузіральна – праз знаёмства з вобразамі вусна-паэтычнай творчасці (тэксты песень), цыклічнай паслядоўнасцю і сімволікай традыцыйнага календара, але і фізічна (праз гукавыманне і харэаграфію). У комплексе гэта развівае не толькі музычныя навыкі і памяць, навыкі маўлення і артыкуляцыі, але і пры апеляцыі да алегарычнасці, сімвалічнасці светаўспрымання ў рамках традыцыйнага ладу жыцця фарміруе перадумовы для асацыятыўнага мыслення, лагічнага аналізу, узбагачэння ўнутранага свету асобы [3, 55-56].

Некаторыя ўласныя напрацоўкі па засваенні шматгалосых спеваў, набытыя падчас вучобы на спецыялізацыі «Этнафоназнаўства» і працы ў дзіцячым фальклорным гурце «Сунічка» цэнтра пазашкольнай

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

работы «Золак» прапаноўваю педагогам. Асноўнай крыніцай навучання і творчага натхнення ў калектыве павінна быць этнафанатэка з аўтэнтычнымі запісамі рознажанравых твораў рэгіёнаў Беларусі. Менавіта шляхам вуснага пераймання з запісаў, дзякуючы імітацыі праз сінхроннае прапявання з «голасам» носьбітаў, потым праз спеўны паказ педагога дасягаецца свабода самастойнага, імправізаванага выканальніцтва ў спеўнай суполцы. Пры распяванні народнай песні на галасы варта ўлічваць вядучую ролю асноўнага напеву (голасу). Вядома, што ў аўтэнтычных калектывах выканаўцы толькі тады падладжваюць падгалоскі, калі гучыць асноўны напеў песні. Таму кіраўніку неабходна перш за ўсё выявіць асноўны напеў. Гэтаму дапаможа веданне яго выканальніцкіх стылявых прыкмет: унісонныя паўторы ў меладычнай лініі; працяг у партыі запявалы; найбольш стабільны выклад пры вар'іраваным паўторы страфы; месцазнаходжанне, як правіла, у сярэдзіне фактуры; тэмбравая і колькасная перавага галасоў.

Пры распяванні песні на галасы трэба ставіць перад выканаўцамі мэту - складаць падгалоскі з улікам характару і меладычна-рытмічнага малюнка асноўнага напеву, у адваротным выпадку ён можа быць прыцемнены, замест таго каб усімі сродкамі дапаўняцца і раскрывацца. Нельга забываць, што варта каму-небудзь са спевакоў захапіцца меладычным малюнкам свайго напеву, як гэты напеў становіцца дамінуючым. Ажыццяўляючы «развядзенне на галасы», кіраўніку трэба абапірацца не толькі на дадзеныя праведзенага тэарэтычнага аналізу, але і на музычна-слыхавыя ўспрыманні і ўяўленні выканаўцаў. Адзінства аналітычнага і слыхавога падыходаў (сінтэз ведаў і слыхавых навыкаў, а таксама іх практычная скіраванасць) дапамогуць авалодаць складаным творчым працэсам распеву песні на галасы. Для гэтага неабходна мэтанакіравана развіваць слыхавое ўспрыманне спевакоў, актывізаваць у іх слыхавую і галасавую каардынацыю, дамагацца пры вар'іраванні натуральнасці, асэнсаванасці і прыгажосці ў меладычных лініях галасоў і спалучэнні іх паміж сабой.

Прапануем некаторыя спосабы развіцця слыхавых навыкаў, апрабаваныя намі ў працы з вучэбнымі і аматарскімі калектывамі. Перш за ўсё – гэта запіс на магнітафон усяго працэсу пошуку падгалоскаў ад яго пачатковай фазы да канчатковага выніку з абавязковым сумесным з выканаўцамі праслухоўваннем кожнай спробы. Гэта дазволіць, з аднаго боку, спевакам пачуць свой варыянт, усю партытуру цалкам і даць ім пэўную адзнаку, з другога – палегчыць педагогу кіраўніцтва працэсам распеву, а ў наступным і адбор найлепшых варыянтаў і іх натаванне. Другі спосаб развіцця слыхавых навыкаў выканаўцаў ажыццяўляецца ў індывідуальнай форме. Ён заключаецца ў тым, што кожнаму са спевакоў прапаноўваецца скласці свой падгалосак, абавязкова ўяўляючы пры гэтым унутраным слыхам гучанне асноўнага напеву і пастаянна суадносячы з ім свой варыянт. Такі складзены загадзя варыянт падчас распеву выступае ў якасці падрыхтаванай імправізацыі.

Трэці спосаб ужываецца, калі склад хору або ансамбля шматлікі (звыш 12 чалавек). У такіх выпадках яго мэтазгодна падзяліць на 2 групы, улічваючы тое, што ў малой групе спевакі лепш чуюць адзін аднаго. Адна група спявае, іншая слухае яе і дае адзнаку, затым наадварот. Так выканаўцы, папераменна імправізуючы і слухаючы адзін аднаго, вучацца на сваіх памылках, паступова іх пераадольваючы.

Праз этнашколу мы зможам навучыць нашых дзяцей быць у суладдзі з сабой і навакольным светам, шанаваць беларусскую спадчыну і працаваць з творчай радасцю. Беларуская моладзь будзе спяваць песні нашых дзядоў на роднай мове. Захаванне беларускіх традыцый, пошук новых накірункаў іх засваення, укаранення ў вучэбна-выхаваўчы працэс будзе садзйнічаць захаванню і трансляцыі акустычнага коду беларусаў.

**Спіс літаратуры:**


1. Дмитриев, Л.Б. Основы вокальной методики / Л.Б. Дмитриев. – М. : Музыка, 2007. – 368 с.: ил., нот.
2. Науменко, Г.М. Фольклорная азбука : учеб. пособ. для нач. шк. / Г.М. Науменко. – М. : Издательский центр «Академия», 1996. – 136 с.
3. Пладунова, Т.А. Шляхі і перспектывы пабудовы мадэлі этнакультурнага выхавання дзяцей і моладзі / Т.А. Пладунова // Пазашкольнае выхаванне. – 2005. – № 11. – С. 12-14.
4. Суполка этнакультурнага выхавання. Праграма для ўстаноў пазашкольнага навучання і выхавання і агульнаадукацыйных школ / скл. В.В. Калацэй, Т.А. Пладунова. – Мінск : НЦМТДіМ, 2003. – 96 с.


РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ